ГАЗЕТА ВДУ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА

# МЫ і ЧАС

№ 5 (331) ПЯТНІЦА, 15 САКАВІКА 2019 ГОДА

**ПО СЛУЧАЮ**

# В КАЖДОЙ ЖЕНЩИНЕ — ВСЯ КРАСОТА ВСЕЛЕННОЙ



В нашем университете практически нет подразделений, где бы работали только представительницы прекрасного пола. Одно из немногочисленных исключений — социально-педагогическая и психологическая служба отдела по воспитательной работе с молодежью. Ее руководитель — педагог-психолог высшей категории Татьяна Александровна Кукина. Вместе с ней трудятся педагог-психолог первой категории Татьяна Михайловна Разумейка, педагог-психолог второй категории Елена Михайловна Озерова и педагоги социальные первой категории Светлана Дмитриевна Русакова и Екатерина Викторовна Гусакова.

Сотрудницы СППС обеспечивают психологическое и социально-педагогическое сопровождение студентов. Специалисты службы работают на каждом факультете — как с группами ребят, так и индивидуально. Юноши и девушки знают, что в любой момент они могут обратиться в социально-педагогическую и психологическую службу за поддержкой, разрешить для себя и найти выход из сложной ситуации.

Гораздо важнее внешней привлекательности красота внутренняя и жизнь в гармонии с собой. Преодолеть стресс и полюбить себя, избавиться от вредных привычек и найти свое место в жизни, подготовиться к созданию семьи и найти свой рецепт счастья — обо всем этом специалисты социально-педагогической и психологической службы знают не понаслышке и с удовольствием делятся своими знаниями со студентами.

А всех прекрасных девушек и женщин нашей альма-матер Татьяна Александровна и ее коллектив поздравляют с прошедшим праздником — 8 Марта и желают любви, нежности, вдохновения и творческих идей. Помните, что в каждой женщине воплощена вся красота Вселенной! Разрешите себе быть счастливой, ведь это — самый главный женский талант!

**На снимке:** *(вверху слева направо)* Татьяна Михайловна Разумейка и Екатерина Викторовна Гусакова; *(внизу слева направо)* Елена Михайловна Озерова, Татьяна Александровна Кукина и Светлана Дмитриевна Русакова.

**Текст и фото Алеси ДУБРОВСКОЙ.**

## ЧИТАЙТЕ В НОМЕРЕ

Юбиляры Люциния Иренеушевна МАРЦИНОВИЧ и Анастасия Антоновна ВОРОНОВА о своих детских мечтах, любимой работе, идеальном выходном дне и настоящем счастье. **Стр. 2**

Абитуриенты-2019 выбирают ВГУ имени П. М. Машерова. **Стр. 2**

Алена Сяргееўна ДЗЯДОВА пра сучасны стан беларускай мовы, запатрабаванасць у ёй грамадзян нашай краіны, а таксама пра абраную прафесію і сённяшнюю студэнцкую моладзь. **Стр. 3**

Сын пісьменніка Міхася Лынькова Леанід Міхайлавіч пра свайго бацьку, яго звычкі, сяброў і апошнія гады жыцця. **Стр. 3—4**

Як адзначаюць 8 Сакавіка дзяўчаты і жанчыны нашага ўніверсітэта і якія падарункі яны атрымліваюць. **Стр. 4**

Пяць дел, которые нужно сделать весной. Поспешите! **Стр. 4**

**Працягваецца падпіска на газету «МЫ І ЧАС». Падпісацца можна ў любым аддзяленні сувязі Рэспублікі Беларусь. Падпісны індэкс — 64098.**



# САМОЕ ГЛАВНОЕ В ЖИЗНИ ДЛЯ НЕЕ — СЕМЬЯ

Старший преподаватель кафедры спортивно-педагогических дисциплин **Люциния Иренеушевна МАРЦИНОВИЧ** родом из Пинска. В 1992 году она стала выпускницей Витебского государственного педагогического института имени С. М. Кирова (сегодня — ВГУ имени П. М. Машерова), ей была присвоена квалификация учителя физической культуры. До этого на протяжении нескольких лет Люциния Иренеушевна работала в институте лаборантом кафедры легкой атлетики. В 2003 году окончила магистратуру нашего учреждения образования по специальности «теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры». Педагог преподает в университете на факультете физической культуры и спорта уже более 15 лет.

7 февраля Люциния Иренеушевна отметила свой юбилейный день рождения. По традиции мы попросили преподавателя ответить на вопросы нашей анкеты.



**Для меня самое главное в жизни** — семья.

**В детстве я мечтала вырасти и стать** стюардессой.

**Мне мешает жить** доверие, **а помогает** — юмор.

**Вывести из душевного равновесия меня может** хамство.

**Работа для меня** — это постоянное обучение и развитие, а общение с молодежью дает возможность оставаться в душе молодой.

**Сильное влияние на меня оказал** роман Харуки Мураками «Охота на овец». Любимой книги нет — все зависит от настроения.

**Мой самый большой страх** — болезнь и потеря близких.

**Если бы я выиграла миллион, то** часть отдала бы на развитие приютов для детей и животных, часть потратила бы на путешествия, остальное вложила бы в недвижимость.

**Мой идеальный выходной день** — это выехать на природу со своими родными и собакой.

**По-настоящему счастливой меня делают** успехи моих дочерей и внука.

# УЛЫБЧИВАЯ. ПОЗИТИВНАЯ. ПОНИМАЮЩАЯ

Так коллеги и студенты отзываются об **Анастасии Антоновне ВОРОНОВОЙ**, старшем преподавателе кафедры педагогики нашего университета.

Анастасия Антоновна уже много лет не только ведет занятия, но и курирует педагогическую практику студентов в летних оздоровительных лагерях. Ребята знают: если что-то у них пойдет не так, они в любое время дня и даже ночи могут позвонить педагогу, спросить ее совета или попросить о помощи. И она никому не откажет.

Анастасия Воронова в 1980 году окончила Витебский государственный педагогический институт имени С. М. Кирова по специальности «белорусский язык и литература». Работала в профессионально-техническом училище № 96, в лицее ВГУ имени П. М. Машерова, была руководителем практик в нашем университете, в 2008 году окончила аспирантуру. На должности старшего преподавателя кафедры педагогики трудится с 2003 года.

В конце февраля Анастасия Антоновна отметила юбилейный день рождения, а сегодня она отвечает на вопросы нашей анкеты.



**Для меня самое главное в жизни** — человечность, общение, любовь... Положительные эмоции, которые нужно не только чувствовать, но и дарить другим. Любить, ценить, уважать, понимать и просто быть.

**В детстве я мечтала стать** артисткой, как и многие девочки. Во всех детских играх брала на себя роль управленца и очень рано поняла, что профессия будет связана с людьми, с общением. Люблю свою работу за это важное и нужное мне общение с людьми.

**Мне мешают жить** некоторая неуверенность в себе, неумение сказать «нет», желание не обидеть в ущерб своим интересам да и характер, спорить с которым не просто. А **помогают** — теплая память о тех, кто так много значил для меня, и любовь тех, кто рядом со мной, моя любимая семья.

**Вывести из душевного равновесия меня могут** обида, несправедливость, грубость и многое другое. Учусь управлять эмоциями, но именно они (положительные) и есть мой двигатель, мой стержень.

**Работа для меня** — это все то многое, что раскрыло меня для себя самой, то, что дарило много радости, особенно на этапах становления. Я люблю наших студентов, таких разных, не всегда удобных, не всегда соответствующих нашим меркам, но таких индивидуальных, увлекающихся, ищущих себя. Я верю в их огромный потенциал.

**Сильное влияние на меня оказала книга...**

Учеба на филологическом факультете сформировала устойчивую любовь к книге. А как человек эмоциональный, я почти каждую прочитанную книгу «проживаю» в течение долгого времени.

В студенчестве мы читали много литературы по программе и не всегда могли осознать все прочитанное из-за больших объемов да и в силу возраста.

Другое дело сейчас. Читать и перечитывать хочется то, что зовет. А это произведения Михаила Булгакова, Михаила Шолохова, Льва Толстого, Владимира Короткевича и других классиков.

**Мой самый большой страх...**

С возрастом страхов становится больше. Дорого все, чем живешь. Все можно пережить, только бы не терять близких людей.

**Если бы я выиграла миллион, то** большую часть потратила бы на мечты моих близких людей, а оставшуюся — на путешествия.

**Мой идеальный выходной день** — это когда нет запланированных дел и можно наполнять его сиюминутными желаниями: заниматься цветами, читать, навестить подруг, отдохнуть в кругу семьи.

**По-настоящему счастливой меня делает** состояние, когда нет тревоги на душе, когда я наполнена положительными эмоциями, а также улыбки дорогих мне людей и реальные надежды на осуществление мечты.



В феврале свои юбилеи также отметили: заместитель декана по учебной работе филологического факультета **Светлана Васильевна Мартынкевич,** старший преподаватель кафедры истории и теории права **Елена Анатольевна Шантырева,** заведующий кафедрой музыки **Сергей Андреевич Карташёв,** заведующий кафедрой дошкольного и начального образования **Оксана Владимировна Данич,** заведующий кафедрой анатомии и физиологии **Инна Ивановна Ефременко,** доцент кафедры изобразительного искусства **Дмитрий Степанович Сенько.**

Желаем нашим юбилярам крепкого здоровья, высокого достатка, семейного счастья, радости и потрясающих событий!



# ОНИ ВЫБИРАЮТ ВГУ!

*По традиции в начале марта в нашем университете прошел день открытых дверей. Более 250 абитуриентов посетили ВГУ имени П. М. Машерова, чтобы подробнее узнать о специальностях, познакомиться с преподавателями, получить бесплатные консультации по предметам централизованного тестирования и вступительных испытаний. Гостями нашей альма-матер стали не только витебские школьники, но и представители 15 районов Витебской области, а также ребята из Гомельской, Могилёвской и Брестской областей. Мы попросили рассказать пришедших абитуриентов, на какой факультет они планируют поступать и почему хотят стать студентами ВГУ.*

**Андрей КРОТОВ, ученик Вороновской средней школы Витебского района:**

— На день открытых дверей в ВГУ имени П. М. Машерова приехал в первый раз. Узнал, что он будет проводиться, из флаеров, которые раздавали в школе, где я учусь. Поскольку мне интересно изучать языки, планирую поступать на филологический факультет. Думаю выбрать специальность «романо-германская филология». В будущем хочу сначала попробовать себя в роли преподавателя, а потом дальше подниматься по карьерной лестнице.





**Екатерина КРАВЦОВА, учащаяся Оршанского колледжа ВГУ имени П. М. Машерова:**

— В детстве мне очень нравилось ходить в садик. Повзрослев, я поняла, что хочу там работать. Сейчас учусь на воспитателя и параллельно работаю по специальности на полставки. Поскольку я люблю детей, то, скорее всего, потом буду поступать в ВГУ на педагогический факультет. В планах получать образование заочно по специальности «дошкольное образование».



**Денис ЗАЦЮПО, ученик средней школы № 27 г. Витебска:**

— Мне всегда нравилось решать сложные задачи. А после уроков Евгении Васильевны Поразенко мой интерес к математике и физике вырос еще больше. Поэтому я решил поступать на факультет математики и информационных технологий в ВГУ. Данный университет выбрал, поскольку хочу учиться поближе к дому (сам я из Витебска). Плюс ко всему мне очень нравятся преподаватели, которые здесь работают. С некоторыми из них я познакомился на подготовительных курсах, которые посещаю с начала осени. Я хожу на курсы русского языка и физики, а недавно записался и на математику. Благодаря занятиям я получил много новых знаний и углубил те, которые имел.

**Карина ВЫСОГОРЕЦ, учащаяся Витебского государственного технологического колледжа:**

— На день открытых дверей я пришла не просто так: хочу стать специалистом по компьютерной безопасности. Сейчас обучаюсь в колледже по похожей специальности, в дальнейшем планирую стать студенткой факультета математики и информационных технологий ВГУ.



**Инна ШИРКЕВИЧ, Евгения ПУДОВА, студентка 3-го курса ФлФ.**
**Снимки Инны ШИРКЕВИЧ.**

**Калі ты размаўляеш з чалавекам на той мове, якую ён разумее, ты размаўляеш з яго галавой. Калі ты размаўляеш з чалавекам на яго роднай мове, ты размаўляеш з яго сэрцам.**

**Нэльсан Мандэла**

# АЛЕНА СЯРГЕЕЎНА ДЗЯДОВА: «РОДНАЙ ДЛЯ МЯНЕ БЫЛА, ЁСЦЬ І БУДЗЕ БЕЛАРУСКАЯ МОВА»

*21 лютага ва ўсім свеце адзначаўся Міжнародны дзень роднай мовы. Напярэдадні гэтай важнай даты я пагутарыла з кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам кафедры беларускага мовазнаўства Аленай Сяргееўнай Дзядовай. Пра што? Пра сучасны стан беларускай мовы, запатрабаванасць у ёй нашых грамадзян, а таксама пра абраную педагогам прафесію і сённяшнюю студэнцкую моладзь... Вось што з гэтага атрымалася.*

**— Алена Сяргееўна, чаму Вы вырашылі спачатку стаць настаўніцай беларускай мовы і літаратуры?**

— Прызнаюся, што стаць настаўніцай марыла з дзяцінства. Між тым, пра тое, які прадмет буду выкладаць, не думала ўсур'ёз. Мне падабалася і руская мова, і англійская. Любіла геаграфію. І толькі ў выпускным класе быў канчаткова зроблены выбар на карысць роднай мовы і літаратуры. Дужа моцны ўплыў на мяне аказала настаўніца Рыма Іосіфаўна Бабашка, якая прыйшла да нас выкладаць адразу пасля заканчэння педінстытута. Менавіта гэты чалавек адкрыў для мяне тое, што ў нас, беларусаў, ёсць на дзіва прыгожая, адметная ад іншых, свая родная мова і літаратура. Цяпер, з вышыні пражытых гадоў, я добра разумею, што менавіта асоба Настаўніка вельмі многа значыць у выбары будучай прафесіі.

**— У штодзённым жыцці Вы размаўляеце выключна па-беларуску?**

— Па-рознаму. Лічу сябе двухмоўнай асобай: магу па-беларуску, магу і па-руску весці суразмоўніцтва. Як калі... Усё залежыць ад сітуацыі і моўнага асяроддзя. Але ж роднай для мяне была, ёсць і будзе беларуская мова. Яе чула ў сям'і з дзяцінства, на ёй думаю, разважаю. Таму ў тым выпадку, калі вяду гаворку па-руску, даводзіцца "перакладаць" свае думкі. З гэтым, дарэчы, пастаянна сутыкаюся сёння пры выкла-



данні рускай мовы як замежнай туркменскім студэнтам.

**— Што дала Вам вучоба ў Віцебскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя С. М. Кірава?**

— Тры важныя рэчы: па-першае, грунтоўныя і трывалыя веды; па-другое, знаёмства з людзьмі, якія неабыякавыя да ўсяго нашага, роднага, беларускага; па-трэцяе, сяброў і аднадумцаў, з якімі і сёння, праз тры дзесяткі гадоў, падтрымліваю добрыя адносіны.

**— Ці былі ў Вас любімыя выкладчыкі? Якія рысы Вы ад іх пераймалі?**

— Безумоўна, былі. Гэта Анатоль Мікалаевіч Канапелька, які выкладаў нам гісторыю беларускай літаратуры, і Злобін Лідзія Іванаўна — выкладчыца сучаснай беларускай мовы. Дзякуючы першаму, я адкрыла для сябе многіх беларускіх пісьменнікаў, адчула сілу іх паэтычнага слова. Заўсёды здзіўлялася, як многа вершаў ведаў на памяць Анатоль Мікалаевіч, як бездакорна цытаваў... Мне хацелася быць падобнай да яго. Глыбокім веданнем матэрыялу, любоўю да беларускага слова былі напоўнены заняткі па мове і ў Лідзіі Іванаўны. Яна дала нам трывалыя веды па сінтаксісе. Гэта былі сапраўдныя Настаўнікі, шчырыя, чалавечныя, справядлівыя, якіх студэнты вельмі паважалі, не дазвалялі сабе прыйсці на заняткі непадрыхтаванымі. Лічу, што гэтым людзям я абавязана вельмі многімі прафесійнымі якасцямі.

**— На Ваш погляд, як можна ацаніць сучасны стан беларускай мовы ў грамадстве?**

— Незбалансаваны руска-беларускі білінгвізм з перавагай ужывання рускай мовы ў розных сферах. Каб змяніць сітуацыю на карысць нашай роднай мовы, у людзей павінна быць найперш імкненне гаварыць па-беларуску. Менавіта так, бо мова — жывая з'ява, яна «прарастае» і «прырастае» там, дзе ёсць людское жаданне.

**— Сёння многія кажуць, што беларуская мова незапатрабаваная, ёй амаль ніхто не карыстаецца. Як Вы ставіцеся да такога меркавання?**

— Адмоўна. Я б сказала, наадварот, валоданне беларускай мовай становіцца ў наш час прадметам раскошы і гонару. Па-беларуску гаварыць сёння не проста модна, але найперш лагічна. Бо мы — беларусы.

**— Што найбольш Вам падабаецца ў Вашай працы?**

— Вельмі люблю тое, што раблю... Мне падабаецца працаваць з сучаснымі студэнтамі. Глядзіш, назіраеш за імі, часам сувымяраеш іх паводзіны і ўчынкі з паводзінамі і ўчынкамі студэнтаў майго пакалення — канца 80-х — пачатку 90-х гадоў...

**— Якімі правіламі Вы кіруецеся ў адносінах да студэнтаў?**

— Патрабавальнасць, справядлівая ацэнка іх ведаў, а таксама імкненне ўбачыць у кожным чалавека, асобу. Стараюся заўважаць у іх найперш станоўчыя рысы, імкнуся не прагледзець іх здольнасці да вучобы і навукі. Не прымаю раўнадушных, абыякавых студэнтаў. Лічу, што абыякавасць да вучобы — гэта ленасць розуму.

**— Якія парады Вы далі б беларускім студэнтам-філолагам?**

— Размаўляйце па-беларуску! Размаўляйце з тымі, хто побач, шчыра, з прыветнай усмешкай на вуснах! Старайцеся жыць паўнавартасным студэнцкім жыццём. Не шукайце ў жыцці лёгкіх дарог, бо, паверце, іх няма. Як кажуць беларусы, ідучы па дарозе, грыбоў не назбіраеш.

**Гутарыла Марыя ЧЫРВІНСКАЯ, студэнтка 3-га курса ФлФ.**

**Фота Іны ШЫРКЕВІЧ.**

# ЖЫВАЯ РАЗМОВА

*Сёння размаўляць па-беларуску становіцца ўсё больш папулярна, асабліва сярод моладзі. Я таксама даволі часта карыстаюся беларускай мовай у паўсядзённым жыцці. Чаму? Па-першае, я навучаюся па спецыяльнасці «беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)». Па-другое, маё цяперашняе месца працы — гэта арт-паб, дзе я як афіцыянт абслугоўваю наведвальнікаў па-беларуску. Менавіта ў пабе я сустрэў выключна беларускамоўных людзей, дарэчы, выпускнікоў нашага ўніверсітэта. З імі я і вырашыў паразмаўляць, задаўшы наступныя пытанні:*

1. *Чаму ты размаўляеш па-беларуску?*
2. *Ці дапамагае табе беларуская мова ў паўсядзённым жыцці?*
3. *Ці была негатыўная рэакцыя з боку іншых, калі яны чулі, што ты размаўляеш па-беларуску?*

**Ірына БАРЫСЕВІЧ, выпускніца факультэта беларускай філалогіі і культуры 2006 года, юрыст-кансультант арт-паба «Торвальд»:**



**1.** Я валодаю не адной мовай, а некалькімі і абіраю патрэбную ў залежнасці ад сітуацыі. Кантактуючы з замежнікамі, выкарыстоўваю свае веданне англійскай мовы ці польскай. У адных асяродках размаўляю і працую з дапамогай беларускай мовы, у іншых — з дапамогай рускай.

**2.** Родная мова, як любая іншая, дапамагае наладзіць камунікацыю.

**3.** Усе канфлікты, звязаныя з выкарыстаннем нашай мовы, зводзяцца звычайна да адной фразы — патрабаванне размаўляць на «нормальном языке». Трэба разумець, што ў такіх выпадках мова — гэта проста падстава «зачапіцца». Сама ж прычына звычайна палягае ў недастатковасці сацыяльнай культуры пэўных асоб.

У кожнага чалавека свой светапогляд, свае пэўныя прынцыпы, але нас, беларусаў, яднае наша агульная гісторыя. Можна не размаўляць па-беларуску ў жыцці, але ведаць і паважаць родную мову, як гэта рабілі нашыя продкі, неабходна.

**Уладзімер БУЛАЎСКІ, выпускнік гістарычнага факультэта 2013 года, арт-менеджар культурнай прасторы VITEBSK4ME:**



**1.** У мяне фактычна не было выбару. Ёсць напаўсур'ёзны адказ, што я дзіцёнак 90-х і часоў беларусізацыі, калі ўсе ўстановы адукацыі, якія я наведваў, былі цалкам ці часткова беларускамоўнымі: садок, школа, універсітэт. Таму гэта не выбар, а арганічны складнік майго жыцця.

**2.** Мова — гэта перш за ўсё сродак камунікацыі, а ўжо потым маркер нацыянальнасці. Таму, натуральна, родная мова мне дапамагае. Напрыклад, знаходзячыся за мяжой, я актыўна камунікаваў з палякамі, украінцамі, чэхамі, бо іх мовы па гучанні і лексічным складзе падобныя да беларускай.

**3.** Непрыемныя сітуацыі ў мяне звычайна здараліся з рускамоўнымі людзьмі, якія нават у Беларусі патрабавалі, каб у размове з імі я пераходзіў на іх мову. Цікава, што некалькі разоў мяне прымалі за ўкраінца.

**Павел КУЛЯШОЎ, студэнт 3-га курса ФлФ.**

**ЦІКАВІНКІ**

# МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ ВА ЎСПАМІНАХ СВАЙГО СЫНА

*Напэўна, кожны з нас памятае са школьнай праграмы аповесць Міхася Лынькова «Міколка-паравоз». Асабліва захапляліся вобразам смелага падлетка савецкія хлопчыкі, якія марылі вырасці і стаць падобнымі да яго. Сёння, на жаль, прыкладамі для сучасных дзяцей з'яўляюцца іншыя героі, але, як правіла, аповесць не пакідае нікога раўнадушным. У свой час гэты твор з задавальненнем прачытала і я, а нядаўна мне пашчасціла пазнаёміцца з сынам Міхася Лынькова — Леанідам Міхайлавічам.*

*Леанід Лынькоў, доктар тэхнічных навук, прафесар, ужо некалькі гадоў на пенсіі. Раней працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі, загадваў кафедрай абароны інфармацыі. Нягледзячы на тэхнічную спецыяльнасць, Леанід Міхайлавіч любіць кнігі: творы многіх пісьменнікаў перачытвае па некалькі разоў.*

*Падчас нашай сустрэчы мы доўга гутарылі з Леанідам Лыньковым пра яго бацьку. Сёння ж я хачу падзяліцца некалькімі яго цікавымі ўспамінамі.*

**Часта рабіў даклады на імпрэзах, прысвечаных юбілеям пісьменнікаў**

«Я застаў той час, калі бацька яшчэ рабіў такія даклады, напрыклад, пра Льва Талстога. Звычайна ўрачыстыя сходы праходзілі ў Доме афіцэраў ці ў тэатры і на іх прысутнічалі кіраўнікі.

Бацька да выступлення



На здымку: Леанід Лынькоў.

заўсёды рыхтаваўся. Шмат пісаў ад рукі, а штосьці друкаваў».

**Любіў распальваць касцёр**

«Бацька вельмі любіў касцёр. Мог сядзець, падкідваць сухое ламачча і назіраць за агнём увесь вечар. Захаваліся фотаздымкі, на якіх ён сядзіць ля вогнішча».

**Захапляўся тэхнікай**

«Ён калекцыянаваў лодачныя матory. Іх у яго было каля 16 штук. Цікава, што калі ўсім забаранілі карыстацца такімі маторамі, бацьку выпісалі асабісты дазвол».

**Катаў турыстаў па Нарачы**

«Бацька заўсёды любіў пакатаць на лодцы тых, хто прыязджаў на возера адпачываць. Матор моцны (дзесяць конскіх сіл), лодка ідзе хутка, вада б'е з усіх бакоў, а бедны турыст, не на жарт спалохаўшыся, марыць пра тое, каб гэтая забава як мага хутчэй скончылася. А ўжо на беразе бедалага ліхаманкава высокквае, увесь мокры, з лодкі ды наўцёкі. Бацька на наступны дзень прапаноўвае яму пракаціцца зноў, дык той адмаўляецца і зараклаецца, што больш ніколі ў жыцці на такое не рашыцца».

**Напоямі не злоўжываў, але паліў**

«Бацька даволі часта паліў. Што тычыцца алкаголю, то выпіваў у меру, ніколі ў жыцці не дазваляў сабе лішняга.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

**НА ЮРФАКУ**

# «РАБСТВА Ў XXI СТАГОДДЗІ: МІФ ЦІ РЭАЛЬНАСЦЬ?»

Менавіта пад такой назвай напрыканцы лютага ў нашым універсітэце прайшоў спецыяльны трэнінг, прымеркаваны да Сусветнага дня сацыяльнай справядлівасці. Яго правяла выпускніца юрыдычнага факультэта Кацярына Рабіцкая. Яна ж летась прыняла ўдзел у мерапрыемстве кампаніі МАМ-ІКС (Міжнародная арганізацыя па міграцыі), якая мае на мэце барацьбу з эксплуатацыяй і гандлем людзьмі.

Падчас выступлення Кацярына расказала шмат важных фактаў па дадзенай тэме. Вось некалькі з іх:

**1.** Гандаль людзьмі — гэта эксплуатацыя народу (вярбоўка, перавозка, перадача) з мэтай атрымання матэрыяльнай выгады. Гэта глабальная праблема, якая ёсць у кожнай краіне без выключэння.

**2.** Як правіла, злачынцы — гэта людзі, якіх ахвяры добра ведаюць і якім давяраюць. Увогуле для трафікёраў (асобы, што займаюцца гандлем жывым таварам) эксплуатацыя людзей з'яўляецца выгадным бізнесам. Штогадовы іх прыбытак ацэньваецца ў 150 мільярдаў долараў.

**3.** Сёння ў рабстве знаходзіцца каля 21 мільёна людзей. На жаль, з кожным годам гэтая лічба павялічваецца.

**4.** Як правіла, трапляюць у працоўнае, сексуальнае ці хатняе рабства тыя людзі, якія з-за беднасці або адсутнасці працы маюць намер пакінуць свой дом у пошуках лепшага жыцця. У большасці выпадкаў яны становяцца ахвярамі гандлю шляхам падману альбо прымусу.

**5.** Калі людзі падвяргаюцца эксплуатацыі, яны вымушаны працаваць шмат гадзін без перапынку, атрымліваючы мізэрную аплату без узнагароджання за сваю працу. Амаль заўсёды ў ахвяр забіраюць дакументы і прымушаюць плаціць выдуманыя даўгі.

Многія з нас думаюць, што ніколі не патрапяць у падобную сітуацыю. Але бяда можа здарыцца з кожным. Тэлефоны бясплатных гарачых ліній МАМ-ІКС па бяспечным выездзе і знаходжанні за мяжой: 8-801-201-5555 (для званкоў па Беларусі), +375-162-21-8888 (для званкоў з-за мяжы).

**Дар'я АНДРЫЦА, студэнтка 3-га курса ФлФ.**


*Первичная профсоюзная организация работников ВГУ имени П. М. Машерова принимает заявки в детские оздоровительные лагеря на летний период.*

**Телефоны:**
**+375 (29) 518-34-81,**
**+375 (44) 559-56-33,**
**8 (0212) 58-97-92**


**ПАСТФАКТУМ**

*Штогод з надыходам вясны ўся прыгожая палова чалавецтва пачынае лічыць дні да 8 Сакавіка. Бо ў гэты святочны дзень іх чакае шмат увагі, кампліментаў, падарункаў і кветак. Мы ж вырашылі даведацца, як адзначаюць Міжнародны жаночы дзень студэнткі, выкладчыцы і супрацоўніцы нашага ўніверсітэта. Для гэтага яны адказалі на два пытанні:*

***1. Які самы запамінальны падарунак вы атрымлівалі на 8 Сакавіка?***

***2. Як у вашай сям'і адзначаюць гэтае свята?***

# СВЯТА КВЕТАК І ЖАНОЧЫХ УСМЕШАК



**Лілія Львоўна АЛІЗАРЧЫК, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры алгебры і методыкі выкладання матэматыкі:**

1. Самым незвычайным падарункам у Міжнародны жаночы дзень для мяне была прапанова выйсці замуж. І праз месяц мы ажаніліся. 8 Сакавіка — гэта самае запамінальнае свята.

2. У нашай сям'і існуе традыцыя сустракаць свята дома — спяваць песні і танчыць. У гэты дзень да нас прыходзяць сябры. Прыязджае дачка, і муж дорыць нам шмат рознакаляровых цюльпанаў, таму што мы іх вельмі любім!



**Вольга БАБІЧ, студэнтка 3-га курса ФФКіС:**

1. Падарункі былі заўсёды звычайнымі: паштоўка, цукеркі, шакалад «Алёнка», кветкі, часцей за ўсё цюльпаны. Лічу, што падарункі — гэта не галоўнае, галоўнае — увага.

2. Звычайна адзначаю 8 Сакавіка з сям'ёй за святочным сталом або з сябрамі. Бывала і такое, што наогул не святкавала.



**Анастасія Васільеўна ЛУК'ЯНАВА, сакратар дэканата факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій:**

1. Самы нечаканы падарунак — гэта падушка для сну. Але ж я ўпэўнена, што кожная жанчына ў гэта дзень асабліва чакае, каб прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва здзівілі яе прыемнымі сюрпрызамі і парадавалі ўвагай. Гэта вельмі важна — адчуваць сябе каханай і патрэбнай.

2. Часцей за ўсё праводжу гэты дзень са сваімі роднымі. Кухня 8 Сакавіка выключна ў распараджэнні мужчын.

**Надзея РАДЗЕЎСКАЯ, студэнтка 3-га курса ФлФ:**

1. Летась у Міжнародны жаночы дзень я была моцна прастуджаная. А мой хлопец, каб зрабіць мне прыемнае, прыехаў з іншага горада і прывёз велізарную торбу прысмакаў.

2. Кожны год да 8 Сакавіка я стараюся зрабіць сваімі рукамі падарунак для матулі. А ў дзень свята люблю гуляць на свежым паветры з сябрамі і з каханым ды назіраць за тым, колькі на вуліцы людзей з прыгожымі букетамі цюльпанаў і мімоз.





**Карына ПІШЧАКА, студэнтка 1-га курса ЮФ:**

1. Тры гады таму на 8 Сакавіка я пазнаёмілася са сваім будучым мужам. Лічу, што гэта сустрэча і ёсць найлепшы падарунак у маім жыцці.

2. У гэты дзень я люблю гуляць на свежым паветры з роднымі, сядзець на лавачцы і атрымліваць асалоду ад вясновага надвор'я. Шчыра кажучы, мне падабаецца больш дарыць падарункі, чым атрымліваць. Таму на свята я еду ў госці да родных і блізкіх, каб іх парадаваць сваёй увагай.

**Аляксандра Алегаўна ДУБІНКІНА, выкладчык кафедры сусветных моў:**

1. У мінулым годзе напярэдадні 8 Сакавіка муж спытаў, які падарунак я хацела б атрымаць. Я адказала, што хачу чаго-небудзь смачнага. І што вы думаеце?! Ён мне падарыў вялізную вэнджаную курыцу. Я была вельмі здзіўлена.

2. Разам з дачушкай у гэты дзень мы ходзім па крамах і купляем новы модны абутак. Вось такая ў нас традыцыя.





**МУХТАРАВА Вольга Віктараўна, старшы інспектар па кадрах аддзела кадраў:**

1. Самы незабыўны падарунак я атрымала ад сваёй старэйшай дачкі. Яна накапіла грошай і купіла мне прыгожыя кветкі. У той момант я была самая шчаслівая маці ва ўсім свеце! Увогуле, для мяне самыя арыгінальныя падарункі — гэта паштоўкі, якія мае дачушкі зрабілі сваімі рукамі.

2. Кожны год мае дачушкі-прыгажуні прыдумляюць нешта новае, каб мяне парадаваць. У іх гэта заўсёды атрымліваецца. Не адстае і муж, які стараецца здзівіць нас, сваіх дзяўчатак. Сямейная традыцыя — праводзіць гэты дзень разам і дарыць радасць адзін аднаму.

*Як бачна, для жанчын і дзяўчат нашага ўніверсітэта найлепшы падарунак — адчуванне сваёй выключнай важнасці ў жыцці любімых і блізкіх. Але, безумоўна, кожнай хочацца, каб на яе звярталі ўвагу не толькі 8 Сакавіка, але як мага часцей. Бо, каб падзякаваць за клопат, выказаць сваю любоў і проста зрабіць прыемнае, не трэба чакаць асаблівага моманту.*

**Дар'я Андрыца і Ганна Мельнікава, студэнткі 3-га курса ФлФ.**

# МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ ВА ЎСПАМІНАХ СВАЙГО СЫНА

**(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)**

На дзень нараджэння звычайна адкаркоўвалі бутэльку шампанскага».

### Быў вельмі гасцінным чалавекам

«Кожнае лета па дарозе на Нарач да нас заязджалі вядомыя людзі. Гэта Сяргей Восіпавіч Прытыцкі, Пётр Міронавіч Машэраў, Андрэй Ягоравіч Макаёнак, Мікалай Фёдаравіч Садковіч, Бэла Ахатаўна Ахмадуліна і многія іншыя. А пісьменнікі Сяргей Іванавіч Грахоўскі і Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў нагогул жылі з намі ў адным доме. Мы сябравалі з іх дзецьмі».

### Апошнія гады жыцця

«Ва ўзросце дзесьці 68 гадоў бацька практычна перастаў пісаць з-за стану свайго здароўя. Складвалася ўражанне, што яму гэта ўжо было нецікава. Зрэдку даваў інтэрв'ю.

У свае апошнія гады жыцця бацька шмат часу праводзіў на лецішчы, непадалёку ад якога знаходзіўся санаторый, дзе адпачывалі яго сябры».

**Алеся МЯДЗІЛЬ, студэнтка 3-га курса ФлФ.**

**ЭНЕРГОНАДЗОР ПРЕДУПРЕЖДАЕТ**

# БУДЬТЕ ОСТОРОЖНЫ!

В период весеннего половодья Витебское МрО филиала «Энергонадзор» напоминает об основных правилах электробезопасности:

- нельзя приближаться к оборванному проводу ближе 8 метров, проникать в действующие электроустановки и самовольно включать и выключать оборудование;
- категорически запрещается находиться около линий электропередачи или трансформаторных подстанций, оказавшихся в зоне подтопления;
- ловить рыбу в охранных зонах ЛЭП (это смертельно опасно для жизни, особенно в период паводка, так как уменьшается безопасный габарит от проводов до поверхности воды);
- запрещается устраивать спортивные и детские игровые площадки вблизи подстанций и воздушных линий.

В случае обнаружения электроустановок, оказавшихся в зоне подтопления, обрыва проводов, искрения, повреждения опор, изоляторов, незакрытых или поврежденных дверей трансформаторных подстанций или электрических щитов необходимо сообщить о повреждении специалистам, дежурным диспетчерам районов электрических сетей по телефонам, указанным на трансформаторных подстанциях, а также в МЧС по номеру 101 или в аварийную службу городских электросетей по телефону 113.

**М.В. МЯСНИКОВ, инспектор энергоинспекции Витебского МрО филиала «Энергонадзор».**

# ПЯТЬ ДЕЛ, КОТОРЫЕ НУЖНО СДЕЛАТЬ ВЕСНОЙ

*Весна — красивое время года, когда природа начинает оживать, пробуждаясь от зимнего сна. Именно в эту пору хочется начать жить по-новому — преобразиться как внешне, так и внутренне. А помогут вам в этом пять наших нехитрых советов.*

### Создать весеннее настроение

Весна всегда олицетворяет собой радость, счастье, надежду на что-то новое и лучшее. Встретьте ее с восхищением и хорошим настроением. Прогуляйтесь по улице, улыбнитесь ласковому солнышку, полюбуйтесь первыми нежными цветочками, насладитесь звоном ручейков и чарующими трелями птиц. А еще — отпразднуйте Масленицу, Сороки, Комоедицу и другие народные праздники: испеките блинов, оладий или печенья в виде жаворонков, «пагушкайтесь» на качелях, спойте народные песни, прокатитесь с ледяных горок.

### Обновить гардероб

Весна — хороший повод навести в доме порядок. Особое внимание стоит уделить гардеробу. За зиму в нашем шкафу накопилось очень много теплых вещей, которые необходимо пересмотреть и сложить, а ненужные выбросить. Однозначно поднимет вам настроение покупка яркой одежды или изысканных аксессуаров. При выборе первой старайтесь отдавать предпочтение нежным тонам, от которых будет исходить легкая весенняя свежесть.

### Преобразиться внешне

Хотите удивить своих родных, знакомых или окружающих — посетите салон красоты либо парикмахерскую и сделайте стрижку / завивку / окраску волос. Ваше преображение обязательно заметят, и вы будете в центре внимания!

### Влюбиться

Весна — прекрасная пора для любви или влюбленности. Есть вероятность того, что именно в это время тот, кто одинок, может встретить свою вторую половинку. Когда мы влюбляемся, мир для нас становится еще более прекрасным. На душе хорошо, и мы сами как будто светимся изнутри. Вырабатывается гормон счастья — серотонин. Поэтому весной обязательно влюбитесь!

### Заняться своим здоровьем

Здоровье у нас одно, и за деньги его не купишь. За долгую холодную зиму наш организм и иммунитет ослабляются, поэтому их весной нужно укреплять. Для этого, по словам медиков, необходимо кушать побольше фруктов, пить витамины и заниматься спортом. Поэтому не пренебрегайте советами ученых и берегите свое здоровье!

**Мария ЧИРВИНСКАЯ, студентка 3-го курса ФлФ.**


МЫ І ЧАС

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі 27.10.2009 г. Рэг. № 747.

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя П. М. МАШЭРАВА»

Адрас рэдакцыі: 210038, г. Віцебск, Маскоўскі пр-т, 33. Тэл. 58-97-92. Эл. пошта: gazeta@vsu.by
Газета надрукавана афсетным спосабам ва УПП «Віцебская абласная друкарня». ЛП 02330/116 ад 27.03.2014 г.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, Віцебск, 210015.
Падпісана да друку 14.03.2019 г. у 15.30. Тыраж 1070.
Аб'ём 1 друк. арк. Зак. 1618.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні неабавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.
Газета выходзіць два разы на месяц.

Галоўны рэдактар А. У. ЯГОРАЎ

Рэдактар А. А. ДУБРОЎСКАЯ